# Вынікі агляду факультэцкіх насценных газет

Гэтымі днямі адбылося пасяджэнне камісіі па правядзенню агляду насценных газет факультэтаў.

Камісія вырашыла:

1) Прысудзіць **першае месца і першую прэмію** ў суме 250 рублёў газеце біялагічнага факультэта **«За мічурынскую біялогію»** (рэдактар **М. Гесь**).

2) **Другое месца і дзве другія прэміі** па 150 рублёў прысудзіць газетам філалагічнага факультэта **«Слова філолага»** (рэдактар газеты **Д. Фактаровіч**) і юрыдычнага факультэта **«Савецкі юрыст»** (рэдактар **В. Сіўцоў**).

3) **Дзве трэція прэміі і трэцяе месца** вызначыць газетам геаграфічнага факультэта **«Географ»** (рэдактар **А. Русіновіч**) і сатырычнай газеце філалагічнага факультэта **«Джала»** (рэдактар **А. Залескі**).

4) Узнагародзіць **Ганаровай граматай** газету **«За мічурынскую біялогію»** і **граматамі рэктарата** насценгазеты **«Патрыёт»**, **«Студэнт гістфака»**, **«За навуку»** і газеты, якія занялі першае, другое і трэцяе месцы.

5) За актыўную работу ў насценным друку ўзнагародзіць **Ганаровай граматай рэктарата** рэдактара газеты **«За мічурынскую біялогію» М. Д. Геся** і намесніка рэдактара **В. І. Міхалкова.**

«Бел. універсітэт», 11 мая 1959 г.